Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# Сталінец

**Орган Добрушскага РК КП(б)Б і Райсовета дэпутатаў працоўных**

№13 (36) | Панядзелак 14 лютага 1944 г. | Цана 15 кап.

Чырвоная Армія паспяхова гоніць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на захад.

Самаадданай працай па аднаўленню народнай гаспадаркі ў вызваленых раёнах, новымі ўдарамі слаўных партызан па варожых тылах дапаможам Чырвонай Арміі наблізіць дзень нашай канчатковай перамогі!

## Прамова таварыша ПАНАМАРЭНКА П. К.

*на X сесіі Вярхоўнага Совета СССР 1-га склікання*

Таварышы дэпутаты! Народны Камісар замежных спраў тав. Молатаў далажыў аб законах, унасімых Советам Народных Камісараў СССР на разгледжанне і зацверджанне сесіі Вярхоўнага Совета. Як гэта відаць з даклада тав. Молатава і прадстаўленых праектаў законаў, справа ідзе аб важнейшых пераўтварэннях у нашай Саюзнай дзяржаве, аб пастаноўцы перад саюзнымі рэспублікамі новых надзвычай важных і адказных задач у галіне абароны нашай краіны і ў галіне знешняй палітыкі. Гэтыя законы з'яўляюцца далейшым развіццём ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, яны з'яўляюцца яскравым выражэннем сувераных праў саюзных рэспублік, уходзячых у Советскі Саюз.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя разбіла ланцугі нацыянальнага прыгнёту, вызваліла народы былой царскай Расіі ад палітычнага бяспраўя, невыноснага палітычнага, эканамічнага і нацыянальнага прыгнёту. Яна дала свабоду працоўным і стварыла ўмовы для будаўніцтва нацыянальнай дзяржаўнасці народаў шматнацыянальнай Расіі.

У дні Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі Ленін і Сталін звярнуліся да народа з Дэкларацыяй праў народаў Расіі, прадстаўляючай сабой праграмны дакумент нашай партыі і першай у свеце Советскай дзяржавы па нацыянальнаму пытанню, заключаючай у сабе вышэйшае выражэнне сувераных праў народаў Расіі.

Прадаўжальнік спраў вялікага Леніна правадыр нашай партыі і народа таварыш Сталін, развіваючы вучэнне Леніна, стварыў адзіна навуковую рэволюцыйную тэорыю вырашэння нацыянальнага пытання і на практыцы ажыццявіў яе ў нашай дзяржаве.

Таварышы Ленін і Сталін прыступілі з самага пачатку Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі да практычнага вырашэння пытання адукацыі, развіцця і ўмацавання советскай дзяржаўнасці народаў Расіі. Ленін і Сталін стварылі Саюз Советскіх Соцыялістычных Рэспублік — магутнейшую і згуртаванейшую ў свеце шматнацыянальную дзяржаву, выкавалі вялікую дружбу народаў, адну з непахісных асноў магутнасці соцыялістычнай дзяржавы. Гэтая дружба народаў была ўжо змацавана крывёю Кастрычніка. Яна ўмацавалася ў годы мірнага будаўніцтва, яна спаяла незгасальнай любоўю да сваёй Радзімы ўсе народы нашай краіны ў суровыя дні Вялікай Айчыннай вайны.

За годы советскай улады вырасла і ўмацавалася створаная Леніным і Сталіным Беларуская Советская Соцыялістычная Рэспубліка. Беларускі народ, аб патрасаючай беднасці якога да рэволюцыі хадзілі легенды, народ, уходзячы тысячамі з Беларусі ў пошуках лепшай долі, пры советскай уладзе стаў на шлях росквіту, шчаслівага жыцця, будаўніцтва свабоднага, шчаслівага, забяспечанага жыцця.

За 25 год советскай улады Беларусь стала краінай з развітай прамысловасцю і соцыялістычнай сельскай гаспадаркай. Нязмерна выраслі дабрабыт і культура беларускага народа. З адсталай, жабрацкай, бяспраўнай акраіны царскай Расіі Беларусь, дзякуючы советскаму ладу, ператварылася ў адну з перадавых советскіх рэспублік.

Шлях бурнага палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця за гістарычны кароткі тэрмін, у годы советскай улады, прайшлі Украінская, Узбекская, Казахская, Азербайджанская, Грузінская, Армянская і іншыя советскія саюзныя рэспублікі.

Унесеныя на зацверджанне сесіі законы азначаюць новы важны крок у развіцці і ўмацаванні нашай дзяржавы, мяркуюць велізарныя расшырэнні праў і палі дзейнасці саюзных рэспублік у галіне знешніх адносін і будаўніцтва ўзброеных сіл. Гэтыя законы сталі магчымымі ў выніку нацыянальнага развіцця і ўмацавання саюзных рэспублік за годы советскай улады, а таксама велізарнага росту і ўмацавання нашай агульнасаюзнай дзяржавы — Саюза Советскіх Соцыялістычных Рэспублік.

Прадастаўленне саюзным рэспублікам права мець вайсковыя фарміраванні і рэспубліканскія народныя камісарыяты абароны будзе спаткана советскім народам з велізарнейшым ухваленнем і радасцю.

Для Беларускай Советскай Соцыялістычнай Рэспублікі гэтыя акты будуць мець велізарнейшае гістарычнае значэнне.

Гісторыя Беларускага народа — гэта ёсць гісторыя крывавай барацьбы і народных паўстанняў супроць іншаземных прыгнятальнікаў. У гэтай барацьбе беларускі народ на працягу ўсіх стагоддзяў апіраўся на падтрымку брацкага рускага народа. Ён заўсёды імкнуўся да народа, звязваў сваё надзеі з ім. Ён рука аб руку ішоў з рускім народам, змагаўся, марыў аб лепшай долі. Ніякія іншаземныя сілы не змаглі зламаць беларускі народ, які апіраўся ў сваёй барацьбе на вялікі рускі народ.

У час вайны за далучэнне рускай дзяржавы беларускія сяляне і гаражане з вялікай радасцю сустракалі рускія войскі і аказвалі актыўную дапамогу ў вызваленні Беларусі ад польскіх феадалаў.

У час Паўночнай вайны з шведамі беларускія

(Працяг на 2-й старонцы)

# АД СОВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

## Аператыўная зводка за 12 лютага

На працягу 12 лютага на **Лужскім** напрамку нашы войскі, зламаўшы супраціўленне праціўніка, авалодалі раённымі цэнтрамі Ленінградскай вобласці і чыгуначным вузлом **Бацецкая**, а таксама з баямі занялі больш 40 іншых населёных пунктаў і сярод іх **Остравенка, Сіценка, Толнава, Шалава, Турово, Жэрэбут, Вычар, Жэлешы, Глухава, Сталбец, Чэрнавіцы.**

Нашы войскі поўнасцю ачысцілі ад праціўніка чыгуначную дарогу **Ленінград—Бацецкая—Ноўгарад** і шчыльна падыйшлі да горада **Луга**, дзе завязалі бой на ўскраінах горада.

Паўночней **Звенігародка** і **Шпола** нашы войскі прадаўжалі весці бaі па знішчэнню акружанай групоўкі праціўніка і авалодалі населёнымі пунктамі **Лешкі, Галякі, Мельнікі, Нецерэбна, Набутаў, Дзеренновец, Карашын.** Адначасова паўночна-заходней Звенігародка нашы войскі адбівалі атакі буйных сіл танкаў і пяхоты праціўніка, імкнуўшыхся прабіцца на дапамогу акружанай групоўкі і нанеслі яму вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы.

На іншых участках фронта разведка, артылерыйска-мінамётная перастрэлка і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

На працягу 11 лютага нашы войскі на ўсіх франтах падбілі і знішчылі 31 нямецкі танк. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі знішчана 58 самалётаў праціўніка, з іх 33 трохматорныя транспартныя самалёты Ю-52.

# Напярэдадні 26-й гадавіны Чырвонай Арміі

Калгаснікі сельгасарцелі імені Калініна дзейсна рыхтуюцца да сустрэчы слаўнай 26-й гадавіны гераічнай Чырвонай Арміі.

У гэтым калгасе воіны Чырвонай Арміі знаходзяць утульнасць і радасную сустрэчу з боку калгаснікаў. Многія калгаснікі рыхтуюць індывідуальныя падарункі для воінаў, якія вызваляюць родную Беларусь.

Калгаснікі старанна дапамагаюць фронту. Толькі за адзін дзень лютага яны з сваіх асабістых фондаў прадалі дзяржаве 2,5 тоны зерня і 3 тоны бульбы.

Калгаснікі ўзялі на сябе абавязацельствы да 26-й гадавіны Чырвонай Арміі поўнасцю засыпаць насенныя і страхавыя фонды і закончыць рамонт сельскагаспадарчага інвентара.

**І. Міхальчанка.**

# ПРАЦА МАЁЙ БРЫГАДЫ

Яшчэ да вайны я быў у сваім калгасе „Чырвоная паляна" брыгадзіра. Я пераканаўся ў тым, што правільная арганізацыя працы і ўмелая расстаноўка людзей з'яўляецца залогам поспеха калгаснай вытворчасці.

Зараз у маёй брыгадзе налічваецца 54 чалавекі. Брыгада падзелена на звенні. Звеннявымі прызначаны вопытныя калгасніцы таварышы Алампіева Н., Алампіева М., Пузікава і інш.

У брыгадзе распачалі рамонт сельскагаспадарчага інвентара. Кіраваць гэтай справай мы даручылі т. Алампіеву П. У нашай брыгадзе ўсе калгаснікі поўнасцю засыпалі сваю норму насенных фондаў.

Наша брыгада працуе дружна, і я лічу, што мы поўнасцю к тэрміну падрыхтуемся да веснавой сяўбы.

**П. Буры.**
брыгадзір калгаса
«Чырвоная паляна».

# Праявіць больш стараннасці

На днях будзе склікана раённая нарада ўсіх кіраўнікоў сельсоветаў, калгасаў і сакратароў комсамольскіх арганізацый па пытанню гатоўнасці калгасаў да вясенняй сяўбы.

У застаўшыяся дні кіраўнікі калгасаў і сельсоветаў павінны прыняць усе меры па заканчэнню работы ў падрыхтоўцы калгасаў да вясны.

# Стыль работы райза

Прайшло ўжо нямала часу, а райземаддзел ні як не можа наладзіць, як след, сваю работу, адсутнічае сапраўдны парадак.

У райземаддзеле не ведаюць, што робіцца ў калгасах па падрыхтоўцы іх да вясенняй сяўбы.

Па звестках райза, напрыклад, па калгасу «7 з'езд Советаў» на 30 студзеня было засыпана насення на 131 проц. да плана, а на 6 лютага стала 57 проц.; па калгасу «Шлях соцыялізма» на 6 лютага было засыпана на 69 проц., а на 10 лютага стала 48 проц. Такое-ж становішча мы маем і ў шмат іншых калгасах.

Не лепш абстаіць справа і з учотам аб ходзе рамонта сельгасінвентара і інш.

Такі стыль работы з'яўляецца нарочным і ад яго райземаддзелу патрэбна зараз-жа адмовіцца.

# ЗА РУБЯЖОМ

## Ваенныя дзеянні ў Італіі

ЛОНДАН, 10 лютага. (ТАСС). Галоўная стаўка войск саюзнікаў у Італіі паведамляе, што часці амерыканскай 5-й арміі прадаўжаюць весці жорсткія бaі на вуліцах горада Кассіно. Праціўнік аказвае жорсткае супраціўленне. У іншых месцах на галоўным фронце амерыканскай 5-й арміі праціўнік прадпрыняў контратакі. Усе яны адбіты. У Анцыо адбываюцца цяжкія баі.

На фронце англійскай 8-й арміі ў выніку дрэннага надвор'я адбываліся толькі дзеянні патрулёў.

Авіяцыя прадаўжала свае налёты на ваенныя аб'екты праціўніка.

## Бaі ў Югаславіі

ЖЭНЕВА, 10 лютага (ТАСС). Як паведамляюць з Югаславіі, часці народна-вызваленчай арміі вядуць на ўсіх участках фронта баі мясцовага значэння. На працягу 20 дзён часці 2-й дывізіі народна-вызваленчай арміі біліся супроць гітлераўскіх і балгарскіх акупацыйных войск, атрадаў Недзіча і чэтнікаў Міхайловіча на ўчастку фронта ў раёне Іванец. У гэтых баях праціўнік страціў забітымі 220, раненымі 290 і палоннымі 80 чалавек. Часці народна-вызваленчай арміі захапілі многа трафей.

У час баёў з гітлераўскімі акупантамі і чэтнікамі ў ваколіцах Гацко байцы народна-вызваленчай арміі захапілі многа ваеннай маёмасці і архіў памочніка Міхайловіча ў Герцаговіне Перышіча. Дакументы, якія маюцца ў гэтым архіве, яшчэ раз пацверджаюць, што паміж акупантамі і чэтнікамі Міхайловіча існуе цеснае супрацоўніцтва.

Адказны рэдактар С. В. СУГАКО.

Друкарня газеты „Сталінец". Адрас рэдакцыі: г. Добруш вул. Варашылава № 31. Тыраж 750 экз.